ЛіМ Літаратура і мастацтва № 25 10 ліпеня 2020

прэзентацыя

# Здабыткі агульнай гісторыі

Новыя кнігі Уладзіміра Ліхадзедава былі прэзентаваны падчас урачыстага адкрыцця выстаўкі «Вайна і мір. Беларусь памятае. Вяртанне» ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Гэта трэці — завяршальны — этап маштабнага культурна-гістарычнага праекта, арганізаванага Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Экспазіцыя прымеркавана да 75-годдзя Вялікай Перамогі.


Фота БелТА.

Падчас адкрыцця выстаўкі.

— Пра гэтую выстаўку можна расказаць літаральна ў трох словах, — заўважыў намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар Бузоўскі падчас цырымоніі адкрыцця. — Перш за ўсё яна пра Вялікую Перамогу, пра тое, як у перыяд ад 1812 да 1945 года загартоўвалася не сталь, а дух народа-пераможцы. Пра незалежнасць, якую сваёй працай, потам і крывёю здабылі нашы дзяды і прадзеды. І, нарэшце, пра паплечніцтва, пра ўсіх бескарыслівых і самаадданых людзей, якія не дзеля грошай і славы, а па заклiку сэрца робяць справу, што потым становіцца агульным здабыткам, агульнай гісторыяй. Выстаўка нібы падводзіць вынік гэтай каласальнай сумеснай працы.

У экспазіцыі прадстаўлены прадметы з асабістага збору краязнаўцы і калекцыянера, публіцыста, лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава, якія збіраліся не адно дзесяцігоддзе. Рукапісныя дакументы, карты, старадрукі, рэдкія кнігі, перыядычныя выданні — усё расказвае пра жыццё беларусаў у розныя гістарычныя перыяды, у часы мірнага жыцця і ліхалецця. Цэнтральную частку займаюць каля 30 кніг серыі «У пошуках страчанага» і іншых выданняў Уладзіміра Ліхадзедава, дзе змешчаны ўнікальныя дакументальныя матэрыялы, якія адлюстроўваюць гістарычнае мінулае беларускай зямлі ў перыяды вайны і міру з 1812 па 1945 гг. Прэзентаваны таксама некалькі навінак: Выдавецкі дом «Звязда» прадставіў кнігі «Блокада» (пра беларусаў — жыхароў і абаронцаў — блакаднага Ленінграда) і «75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне». Важная частка апошняй — красамоўны аповед пра выгляд і становішча беларускіх мястэчак і гарадоў да вайны, падчас і пасля яе. У ліку новых выданняў — «Беларусь шматнацыянальная». Кніга пабачыла свет у выдавецтве «Альфа кніга».

Падчас урачыстага адкрыцця выстаўкі старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Віктар Лісковіч распавёў:

— Больш чым 1,3 мільёна жыхароў Беларусі ваявалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сярод беларусаў 446 Герояў Савецкага Саюза, прытым чацвёра з іх узнагароджаны гэтым званнем двойчы. Больш як 400 тысяч беларусаў атрымалі баявыя ордэны і медалі. Яны любілі Беларусь і сваім прыкладам паказвалі, як гэта трэба рабіць... Мір і спакой, які мы сёння маем, трэба не толькі захоўваць, але і адстойваць, бо мы атрымалі гэтую спадчыну не дарэмна і згубіць яе права не маем.

Сярод найкаштоўнейшых экспанатаў — арыгінальныя літаграфіі ўдзельніка напалеонаўскай кампаніі, мастака-баталіста Фабера дэ Фора, баявыя лісткі за 1944 год, «Прывілей караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы», напісаны старабеларускай мовай і датаваны пачаткам XVII стагоддзя. Арганізатары адзначылі: некаторыя прадметы перададзены Уладзімірам Ліхадзедавым у дар Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Між тым усе ўдзельнікі адкрыцця атрымалі ў падарунак сувеніры — рэпрынты старых паштовак з выявамі беларускіх гарадоў і мястэчак і копіі старонак «Гродзенскіх губернскіх ведамасцяў».

Выстаўка «Вайна і мір. Беларусь памятае. Вяртанне» будзе адкрыта для наведвальнікаў да 30 снежня.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**